ШТРАФНЫЯ САНКЦЫІ — ЛЕПШЫ АРГУМЕНТ НА КАРЫСЦЬ РАЗДЗЕЛЬНАГА ЗБОРУ СМЕЦЦЯ?

Як дабіцца, каб практыка раздзельнага збору смецця прыжылася ў Беларусі? Як заахвоціць насельніцтва да здачы шклатары? І ці будзе загружаны сыравінай завод па сартаванні змешанага шклабою, які будуецца сёння ў прамзоне Калядзічы пад Мінскам? Адказы на гэтыя пытанні паспрабавалі знайсці ўдзельнікі «круглага» стала, які прайшоў у Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы.

— Па экспертных ацэнках, штогадовы аб'ём утварэння адходаў шкла складае ў нашай краіне каля 200 тысяч тон. Зараз зборам шклатары і адходаў шкла займаюцца каля тысячы прыёмных пунктаў шклатары і нарыхтоўкі другаснай сыравіны. Акрамя таго, збор адходаў шкла ажыццяўляецца і з дапамогай спецыяльных кантэйнераў з наступным дасартаваннем іх на станцыях сартавання камунальных адходаў, — расказала **намеснік генеральнага дырэктара ДА «Белрэсурсы» Наталля ЛАПКО.**

Асноўнымі спажыўцамі шклабою ў рэспубліцы з'яўляцца шклозавод «Елізава», «Белеўратара», Гомельскі шклатарны завод, Гродзенскі шклозавод і «Белшклопрам». У сувязі з незабяспечанасцю айчынным шклабоем прадпрыемствы шкляной прамысловасці вымушаны закупляць шклабой за межамі Беларусі. Так, у 2011 годзе шклозаводамі па імпарце было ўвезена 24,7 тысячы тон шклабою на суму 2,6 млн долараў ЗША, што ў 1,7 раза больш, чым у папярэднім годзе. Улічваючы нежаданне заводаў прымаць змешаны шклабой, нарыхтоўчыя арганізацыі былі вымушаны арганізаваць яго ручное сартаванне. А ў кастрычніку 2010 года паміж «Белрэсурсамі» і кампаніяй «Біндэр+Ко» быў заключаны кантракт на пастаўку завода па сартаванні змешанага шклабою коштам 5 500 000 еўра.

Вытворчая магутнасць завода складае 120 тысяч тон пры трохзменнай працы. Разліковая патрэба ў сыравіне пры рабоце завода ў адну змену — 4 000 тон у месяц (25 тон у гадзіну і 200 тон у суткі). Такім чынам, пры дастаўцы сыравіны па чыгуначнай ветцы ў сярэднім патрабуецца ў суткі 3 вагоны, а ў месяц — 65 вагонаў, для чаго трэба ўжо сёння стварыць дакладную лагістычную сістэму. У арганізацыях, якія ўваходзяць у склад «Белрэсурсаў» і маюць чыгуначную ветку, былі створаны назапашвальныя пляцоўкі для збору змешанага тарнага шклабою ў Брэсце, Пінску, Лунінцы, Кобрыне, Баранавічах, Івацэвічах, Гомелі, Бабруйску, Віцебску і Магілёве. Распачаты таксама работы па стварэнні назапашвальных пляцовак у абласцях. Так, у Брэсцкай вобласці ўжо створана 17 назапашвальных пляцовак

«У Германіі пры здачы пэт-бутэлькі чалавеку вяртаюць 25 цэнтаў. А ў нас за кілаграм шклатары ў нарыхтоўчых пунктах (гэта 3-4 бутэлькі) плацяць аж 200 (!) рублёў».

і 18 — у Віцебскай. У іншых абласцях работы па стварэнні назапашвальных пляцовак працягваюцца.

Наталля Лапко расказала журналістам, што аб'яднаннем «Белрэсурсы» падпісаны дагаворы аб пастаўках змешанага шклабою з 20 арганізацыямі краіны ў колькасці 10 тысяч тон. Работы па заключэнні прамых дагавораў на пастаўку змешанага шклабою працягваюцца. Аднак асноўныя праблемы звязаны са зборам шклабою ў насельніцтва:

— Па даручэнні ўрада аб'яднаннем былі расстаўленыя спецыяльныя кантэйнеры для збору шклабою ў жылым сектары Мінска. Кантэйнеры мелі спецыяльную адтуліну, а іх накрыўка была наглуха закручана балтамі. Аднак калі нарыхтоўшчыкі прыехалі для таго, каб спустошыць кантэйнеры, то ўбачылі, што крышкі цалкам адарваныя, і мінчане пераўтварылі кантэйнеры для шкла ў звычайныя сметніцы: іх прыстасавалі пад выкід будаўнічага смецця, адпрацаванай бытавой тэхнікі і гэтак далей...

— Шчыра кажучы, нас сёння хвалююць два пытанні: дзе расставіць кантэйнеры для збору шкла і як яны будуць напаўняцца? — падзяліўся сваім бачаннем праблемы **выканаўца абавязкаў начальніка аддзела энергетыкі Мінскага гарвыканкама Анатоль ЛАЎНЯЧУК.** — На 2012 год на закупку кантэйнераў для раздзельнага збору смецця ўжо было выдзелена горадам 700 млн рублёў. Усяго ў Мінску зараз усталявана каля 14 тысяч кантэйнераў для раздзельнага збору смецця. Гэта вельмі нязначная колькасць для амаль двухмільённага горада. Але сёння перад намі пастаўлена новая задача — расставіць у сталіцы яшчэ каля 3 тысяч кантэйнераў менавіта для збору шкла. Па-першае, востра стаіць пытанне з фінансаваннем: дзе ўзяць такія грошы? Мяркуем, побач з пяціпавярховікамі, дзе няма смеццеправода і ўсталяваны кантэйнеры для асобнага збору смецця, два з шасці кантэйнераў перафарбаваць у жоўты колер, каб прывучыць людзей кідаць пустыя бутэлькі менавіта ў іх. Ёсць пытанні і з месцам устаноўкі кантэйнераў: нашы двары настолькі запоўнены прыватнымі аўтамашынамі, што машына для збору шклатары ў іх элементарна не трапіць. Асабіста я сумняваюся, што нашы людзі панясуць

Фота Марыны БЕГУНОВАЙ.

шклатару нават за 100 метраў ад свайго пад'езда. І тым больш не стануць яе сартаваць па колерах, так, як гэта робяць у краінах Еўропы. Там нават у машынах, якія збіраюць здадзенае насельніцтвам шкло, прадугледжаны тры кантэйнеры: для раздзельнага збору карычневага, зялёнага і бясколернага шкла. А ў нас кантэйнеры могуць устанавіць там, дзе людзі ўвогуле не ходзяць, так як гэта зрабілі, напрыклад, на вуліцы Нёманскай. На наша пытанне, як такое магло прыйсці ў галаву, нам адказалі: «А нідзе не прапісана, дзе трэба ўстанаўліваць кантэйнеры для раздзельнага збору смецця».

Па словах спецыяліста, у Заходняй Еўропе насельніцтва ўдалося прывучыць да раздзельнага збору смецця, у тым ліку дзякуючы штрафным санкцыям. Але спатрэбілася для гэтага не адно дзесяцігоддзе. У той жа Германіі і Польшчы ўвогуле няма кантэйнераў для агульнага збору смецця. Ёсць кантэйнеры для арганікі, шкла, макулатуры, пэт-бутэлек. І калі, скажам, у кантэйнерах для арганікі з'явіцца пластыкавая тара, то штраф будзе накладзены на ўвесь дом.

—Таму суседзі там пільна сочаць адзін за адным, — пажартаваў Анатоль Лаўнячук. — Дарэчы, у Германіі пры здачы пэт-бутэлькі чалавеку вяртаюць 25 цэнтаў. Уявіце сабе: 1 еўра за 4 бутэлькі, праўда, прымаюць толькі пэт-тару, вырабленую ў Германіі. А ў нас за кілаграм шклатары ў нарыхтоўчых пунктах (гэта 3-4 бутэлькі) плацяць аж 200 (!) рублёў. Няўжо хтосьці за гэтыя грошы будзе здаваць бутэлькі? У савецкія часы адна бутэлька каштавала 12 капеек, а буханка хлеба — ад 14 да 20 капеек. А колькі сёння каштуе хлеб? Увогуле мы лічым, што ў насельніцтва павінен быць выбар: або здаваць шклатару, якая не падлягае другаснаму выкарыстанню, за грошы ў нарыхтоўчыя пункты, але для гэтага трэба зацікавіць насельніцтва матэрыяльна, або несці яе ў кантэйнер. Аднак без жорсткага кантролю за раздзяленнем адходаў з адпаведнымі штрафнымі санкцыямі, мяркую, складана будзе прывучыць наш народ да раздзельнага збору смецця.

Ёсць, па словах Анатоля Лаўнечука, і яшчэ адна праблема — кадравая. Сёння заробак кіроўцы спецкамунаўтатранса складае 3,5 млн рублёў, а кіроўцы грамадскага транспарту — 5,5 млн рублёў. Яшчэ два гады ўсё было наадварот, таму людзі масава з прадпрыемства звальняюцца.

— Нам не дазваляюць павышаць тарыф на вываз смецця больш чым на 20%. Але прызнайцеся шчыра: калі б тарыф на вываз смецця быў не 2,5 тысячы рублёў, а 5 тысяч, ці моцна б гэта ўдарыла па сямейным бюджэце? Затое колькі праблем гораду ўдалося б вырашыць, — дадаў спецыяліст.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЯК БУДЗЕ АДБЫВАЦЦА САРТАВАННЕ ЗМЕШАНАГА ШКЛАБОЮ НА НОВЫМ ЗАВОДЗЕ?

Змешаны шклабой загружаецца ў бункер. Далей па канвееры сыравіна трапляе ў будынак завода, дзе на першапачатковым этапе пры дапамозе магніта ад шкла аддзяляюцца каляровыя металы. Затым сыравіна па канвееры падаецца на ўстаноўку для выдалення смецця і прасейвання шклабою. Буйныя фракцыі накіроўваюцца ў драбілку. Пасля таго як са шклабою выдалена буйное смецце, ён паўторна праходзіць праз прасейванне і драбілку. Далей шклабой трапляе ва ўстаноўку, якая аддзяляе прымесі каляровых металаў. Затым ён раздзяляецца на фракцыі, у залежнасці ад памеру. Раздзяленне шклабою па колеры і выдаленне з яго керамікі і шкла з іншым хімічным саставам ажыццяўляецца спецыяльнымі ўстаноўкамі. Далей, з дапамогай усмоктвання, ад шклабою аддзяляецца лёгкае смецце. Завяршэннем працэсу сартавання шкла становіцца яго раздзяленне па колеры. Шкло рознага колеру мае розны хімічны склад. На першым этапе ажыццяўляецца аддзяленне шклабою ад прымесяў керамікі і іншага шкла, якое адрозніваецца па хімічным саставе (напрыклад, аконнага шкла) і сартаванне па колеры. Другі этап — паўторнае аддзяленне шкла, якое адрозніваецца па хімічным саставе, і найдрабнейшых металічных элементаў, сартаванне шклабою па колеру. Трэці этап — канчатковае ачышчэнне шклабою і сартаванне па колеры. Увесь працэс сартавання поўнасцю аўтаматызаваны.

■ Медыяпрастора

КАЛІ «МП» У ВАШЫМ ДОМЕ — УСЁ ПРА МІНШЧЫНУ ВЯДОМА!

Зрабіць варты выбар сярод вялікай колькасці газет і часопісаў нашай краіны па-сапраўднаму цяжка, аднак не сакрэт: чытацкая аўдыторыя ва ўсім свеце перш-наперш аддае перавагу менавіта рэгіянальным навінам. Прычым асноўнай крыніцай такіх навін, надзейным сябрам, памочнікам і дарадцам тысяч жыхароў Міншчыны на працягу дзесяцігоддзяў з'яўляецца галоўнае перыядычнае выданне цэнтральнай вобласці Беларусі — «Мінская праўда».

Першы нумар «МП» выйшаў 1 лістапада 1950 года, аднак паважны ўзрост — не больш чым канстатацыя факта. Перш-наперш «Мінская праўда» была і застаецца сучасным, разлічаным на самага шырокага чытача выданнем. Дзеці і падлеткі, студэнты і маладыя спецыялісты, работнікі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, пенсіянеры — кожны з іх знойдзе на старонках газеты актуальныя і цікавыя для сябе матэрыялы. «МП» мае больш за два дзясяткі бясплатных разнастайных тэматычных дадаткаў, надае вялікую ўвагу асвятленню пытанняў аховы здароўя, адукацыі, работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, заробкаў, пенсій і стыпендый, дзейнасці дзяржаўных органаў і органаў мясцовага самакіравання, захаванню культурнай спадчыны цэнтральнага рэгіёна Беларусі, адраджэнню народных традыцый, сямейных каштоўнасцяў, папулярызацыі беларускай мовы. І, зразумела, газета традыцыйна прапануе самую цікавую, аператыўную і эксклюзіўную інфармацыю аб жыцці Міншчыны і ўсіх рэгіёнаў вобласці. «Мінская праўда» — як добры і шчыры сусед: заўжды побач!

Аформіць падпіску на «Мінскую праўду» можна ў любым аддзяленні сувязі як Міншчыны, так і іншых рэгіёнаў краіны. Пры гэтым, нягледзячы на аб'ектыўныя цяжкасці апошняга часу, «МП» прыняла няпростае рашэнне захаваць падпісную цану на трэці квартал і другое паўгоддзе без змяненняў — газета была і па-ранейшаму застаецца самым даступным сярод усіх рэспубліканскіх і абласных выданняў Беларусі.

НАВУКОЎЦЫ З БЕЛАРУСІ, РАСІІ І УКРАІНЫ АБМЯРКУЮЦЬ АГУЛЬНУЮ ГІСТОРЫЮ

Міжнародная канферэнцыя «Расія, Беларусь, Украіна: гісторыя, сучаснасць, будучыня» пройдзе 12-13 чэрвеня ў Мінску. Арганізатары канферэнцыі — аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, Інстытут гісторыі НАН Беларусі і прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь — Расійскі цэнтр навукі і культуры ў Мінску.

Падчас канферэнцыі прадстаўнікі акадэмічнай і ўніверсітэцкай навукі трох краін, а таксама грамадскія дзеячы, студэнты і школьнікі абмяркуюць пытанні зараджэння дзяржаўнасці ва ўсходнеславянскіх землях, палітычнае развіццё славян у сярэднявеччы, узаемаадносіны Расіі і Расійскай імперыі з навакольнымі краінамі, гістарычны вопыт савецкага перыяду і іншыя пытанні. Таксама будуць прэзентаваны дзве фотавыставы, адбудзецца ўзнагароджанне пераможцаў і лаўрэатаў інтэрнэт-віктарыны, прысвечанай 200-годдзю перамогі ў вайне 1812 года.

Іван СТУЖКА.

З ПЕСНІ СЛОВА НЕ ВЫКІНЕШ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— Гэта літаратура, з якой пачалося наша духоўнае адраджэнне, — адзначае Віктар Шніп. — Факсімільныя выданні ажыццявіліся дзякуючы сумесным праектам выдавецтва з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Але да юбілею класікаў беларускай літаратуры падрыхтаваны шэраг выданняў. Напрыклад, кнігі ў серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі».

4. МУЗЫКА СЛОЎ

Успамінаць класікаў хацелася і падчас канцэрта, прысвечанага ім. Цікава, як бы яны самі ацанілі тыя песні, якія былі створаны на іх словы? Ці тыя, якія ствараюцца зараз? Цікава, бо ў іх паэтычных творах, нават калі іх чытаеш, адчуваецца мелодыка, а рыфмы, здаецца, самі просяць песні. І часам думаеш, што кампазітар пачуў тую мелодыю, якая існавала ў момант стварэння верша ў сэрцы паэта. Інакш як патлумачыць, што так арганічна ўспрымаюцца і адразу кладуцца на душу песні на словы Купалы і Коласа. Што ні песня — то асобны настрой. І пра іх ніколі не скажаш, што гэта песні на адзін дзень: кранаюць і дзядуляў з бабулямі, і мам з татамі, і іх дзяцей. Прычым, як вядомыя ўжо шлягеры, так і новыя творы. Насамрэч паэзія Песняроў пакідае і сучасным кампазітарам вялікую прастору для творчасці: не ўсе іх вершы яшчэ пакладзены на музыку.

Эдуард Зарыцкі — адзін з кампазітараў, які чэрпае натхненне менавіта ў класічнай беларускай паэзіі. У яго ўжо быў цыкл з 10 песень на словы Якуба Коласа. Але ў фестывальнай праграме, прысвечанай юбілею класікаў, прагучала некалькі прэм'ер — песень на словы Янкі Купалы і Якуба Коласа. І адна песня, прысвечаная ім, — «Дзве зоркі» на словы Васіля Жуковіча, якую праспявалі дуэтам маладыя прыгожыя хлопцы, пераможцы конкурсу ў Маладзечне: Дзмітрый Качароўскі і Аляксандр Салаўёў. Гэтая песня і дала назву галоўнай праграме фестывалю, падрыхтаванай Нацыянальным канцэртным аркестрам Беларусі.

— Амаль усе мае песні — на беларускай мове, ёсць цэлыя цыклы на словы розных паэтаў: Коласа, Караткевіча, Багдановіча, ёсць песні на словы паэтаў, на вершы якіх не асабліва бяруцца пісаць песні — Багушэвіча, Чачота... У песенных цыклах я, напэўна, чэмпіён, — прызнаецца Эдуард Зарыцкі. — Мне гэта вельмі цікава, таму што ёсць магчымасць гэтым паэтам надаць сучаснае гучанне — праз выкананне аркестра. Я да нашых класічных паэтаў стаўлюся, як да сваіх аднагодкаў. Можа, таму ў нас атрымліваюцца сучасныя песні.

Праз сучасныя рытмы сапраўды можна выхоўваць любоў да беларускага слова. Вось бы сучасных песень з'яўлялася больш, ды каб яны не выглядалі асобнымі, амаль выставачна-музейнымі экзэмплярамі... А каб сапраўды «пайшлі ў народ», каб хацелася іх спяваць проста таму, што хочацца спяваць менавіта па-беларуску. Як **міністру культуры Паўлу Латушку**:

— Памятаю з дзяцінства: мае дзядулі, бабулі, бацькі, калі збіраліся на святы, заўсёды спявалі. Шчыра скажу: калі да мяне ў госці прыходзяць сябры і мы спяваем пад гітару, я, выкарыстоўваючы сучасныя тэхналогіі iPad, знаходжу беларускую песню, якую мы пазней спяваем. За вечар можам заспяваць 20, 30, а то і 40 беларускіх песень. У большасці — беларускамоўныя. Я хацеў бы, каб традыцыя, якая прыйшла ад нашых прадзедаў, сёння развівалася ў беларускіх дамах, кватэрах, хатах, і была перададзена нашым дзецям. І яны, калі стануць дарослымі, таксама будуць спяваць беларускія песні... Я перакананы, што Беларусь мае багатую песенную традыцыю, менавіта беларускамоўную, якая ідзе з глыбіні стагоддзяў і якая, дзякуй Богу, захавалася. На падставе гэтай традыцыі мы можам развіваць сучаснае песеннае слова і сучасную беларускую песню. Фестываль у Маладзечне з'яўляецца апафеозам гэтай працы. Зразумела, што гэтая праца павінна мець сістэмны характар, штодзённы. Міністэрства культуры стымулюе разнастайныя песенныя праекты, звязаныя з падтрымкай беларускага песеннага слова, беларускага песеннага мастацтва. Так, у мінулым годзе мы рэалізавалі праект «Залатая калекцыя беларускай песні», якім прадэманстравалі, што ў XX стагоддзі і на пачатку XXI было створана шмат цікавых шлягерных папулярных беларускамоўных песень. Гэты праект прадстаўлены ў Маладзечне на асобным канцэрце дзякуючы артыстам Маладзёжнага тэатра эстрады. Гэтым праектам мы хацелі паказаць усім кампазітарам і паэтам, што варта пісаць песні на беларускай мове!

Саліст Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі задае настрой першага фестывальнага дня.
Фота Ніны ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Зразумела, мы фінансуем і іншыя праекты: напрыклад арт-група «Беларусы» прадставіла праграму «Сусветныя хіты на беларускай мове». Падобныя праекты мы будзем падтрымліваць. Вельмі важна, каб гэтая праца праводзілася ў дамах культуры, у цэнтрах культуры, у клубах, у рэгіёнах, на вёсцы, асабліва з моладдзю, каб яна спявала беларускія песні, танцавала беларускія танцы, каб захоўвалася беларуская нацыянальная традыцыя.

Тое, што ўжо пачулі ў Маладзечне, можа паслухаць і ўся краіна. Белтэлерадыёкампанія пакажа асноўныя канцэрты 15 і 16 чэрвеня ў вечаровым эфіры. Ды што казаць — бадай што ў начным. Можа, гэта якраз і заінтрыгуе моладзь? А астатнім дадасць упартасці ў жаданні дачакацца беларускага слова ў начным тэлеэфіры.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, Ларыса ЦІМОШЫК.

Аднарукіх бандытаў... абрабавалі

У Віцебску ўкралі грошы з сейфа залы гульнявых аўтаматаў.

Пра гэта паведамілі ў Кастрычніцкі раённы аддзел унутраных спраў з адміністрацыі прыватнага прадпрыемства. Каля шасці гадзін наведвальнік ў зале гульнявых аўтаматаў, скарыстаўшыся няўважлівасцю адміністратара, з незачыненага сейфа ўкраў грашовую выручку. Злодзей забраў больш за 1,1 мільёна рублёў. Міліцыянерамі быў затрыманы 22-гадовы непрацуючы мясцовы жыхар.

«Узялі» ламбард

Ламбард «узялі» два зладзеі ў Віцебску. Знаходзячыся днём у памяшканні ламбарда фірмы «Кабан і К» па вуліцы Чкалава, з незачыненай шафы зламыснікі здзейснілі крадзеж больш за 13,8 мільёна рублёў.

Зладзеі былі затрыманы міліцыяй пры дапамозе службовага сабакі. Высветлілася, што на злачынства пайшлі два раней судзімыя, непрацуючыя мясцовыя жыхары 1985 і 1987 гадоў нараджэння.

Апёкся ад вогнішча

Чатырохгадовы хлопчык атрымаў апёкі падчас адпачынку з бацькамі на беразе возера Лукомльскае пры распальванні вогнішча.

Дзіця шпіталізаваны ў Новалукомльскую цэнтральную раённую бальніцу з апёкамі 2-3 ступені твару, шыі, правай рукі, цела. Стан дзіцяці цяжкі. Пра гэта паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**На торги выставляется 15 лотов движимого и недвижимого имущества ОАО «Глубокская птицефабрика»** общей стоимостью 3 084 987 000 белорусских рублей, более подробную информацию можно получить на сайте Высшего Хозяйственного Суда Республики Беларусь **http://court.by/vitebsk/divestiture/**
Собственник (владелец) имущества	Открытое акционерное общество «Глубокская птицефабрика» (Глубокский р-н, д. Марцебылино)
Местонахождение (адрес) имущества	Глубокский р-н, д. Марцебылино и д. Запрудье
Информация об имеющихся обременениях имущества	Обременений не имеется
Место (адрес), дата и время проведения торгов	**Витебская обл., г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 322, 13 июля 2012 года в 14 часов 30 минут**
Справочная информация об организаторе торгов	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 322 **http://vitebsk.court.by/** Судебный исполнитель Лесковец Денис Анатольевич, тел.: 8 (0212) 49 13 46, +375(44) 744 63 00 Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области не позднее 14 часов 00 минут 13.07.2012 года: - до 18.06.2012 г. денежные средства перечислять на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в филиале № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНН 300007670; - с 18.06.2012 г. денежные средства перечислять на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в филиале № 200 – Витебское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 635, УНН 300007670. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.

ЛОГОЙСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 12 июля 2012 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в г. Логойске

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена, бел. рублей	Расходы по подготовке землеустроительной документации	Сумма задатка, бел. руб.
1	г. Логойск, микрорайон жилой застройки «Луговой» № 189 с кадаровым номером 623250100001002490	0,10	Разрабатывается проект на электроснабжение	41 816 600	3 347 730	4 182 000
2	г. Логойск, микрорайон жилой застройки «Луговой» № 193 с кадаровым номером 623250100001002491	0,10	Разрабатывается проект на электроснабжение	40 611 800	2 702 543	4 061 180
3	г. Логойск, микрорайон жилой застройки «Луговой» № 226 с кадаровым номером 623250100001002499	0,10	Разрабатывается проект на электроснабжение	40 611 800	2 702 543	4 061 180

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на р/с 3641061100212 в ЦБУ № 611 филиала № 500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601, в г. Логойске. Получатель – Логойский райисполком. УНН 600181814. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **12 июля 2012 года в 10.00** по адресу: г. Логойск, ул. Советская, д. 15, третий этаж, актовый зал. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Советская, д. 15, отдел землеустроительной службы Логойского райисполкома, каб. 27. Последний день приема заявлений **6 июля 2012 года до 17.00.** Контактные телефоны: **(8 01774) 55 0 38, 52 7 15, 52 7 20, 21 0 22.** Наш сайт в интернете: **logoysk.gov.by.**

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ЗАСТРОЙЩИКА от 14.12.2009 г.

Сведения о застройщике:

Белорусско-английское Совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (СЗАО «ЛадаГарант»). СЗАО «ЛадаГарант» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС – Холдинг» ЗАО.

Местонахождение: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 4Н.

Режим работы: рабочие дни – с понедельника по пятницу – рабочие часы – с 8 ч.30 мин. до 17 ч. 30 мин., обед – с 13 ч. 00 мин. – до 14 ч. 00 мин., выходные дни – суббота, воскресенье.

Данные о государственной регистрации: зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100934617.

Сведения о проектах жилых домов, введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:

1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 по ул. Грушевская в г. Минске;
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 по ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки;
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 по ул. Щорса.
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 по ул. Щорса 3-я.
5. 9-этажный 4-секционный 135-квартирный жилой дом № 1 по ул. Щорса.

Лицензия на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I, II уровней ответственности и проведения инженерных изысканий для этих целей» № 02250/0005789 со сроком действия по 29.11.2014 г., выданная Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь.

Цель проекта – строительство объекта «Многоэтажные жилые дома с объектами административно-общественного назначения в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса, II этап» –

жилые дома, не относящиеся к домам повышенной комфортности, включающие в себя:

жилой дом № 3 по генплану – 10-этажный, 7-секционный, 261-квартирный;

жилой дом № 2 по генплану – 9-этажный, 4-секционный, 135-квартирный;

административное здание № 2а по генплану – 8-этажное, 1-секционное,

с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц, путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

Сведения о сроках реализации.

Начало строительства – июль 2009 г.

Ввод объекта в эксплуатацию – II-ое полугодие 2012 г.

У Застройщика имеются:

- решения Мингорисполкома от 24.11.2005 г. № 2080 о предоставлении земельного участка;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» (заключения от 12.03.2008 г. № 637-5/08; от 12.03.2008 г. № 636-5/08; от 14.03.2008 г. № 648-5/08; от 10.06.2008 г. №1388-5/08; от 10.06.2008 г. № 1390-5/08; от 10.06.2008 г. № 1391-5/08; от 10.06.2008 г. № 1392-5/08; от 04.08.2010 г. № 873-15/10), государственную экологическую экспертизу (заключение № 391 от 17.12.2007 г.);
- решения Мингорисполкома о разрешении на строительство № 2378 (I) от 09.10.2008 г., №966 от 29.04.2010 г.
- разрешение на производство строительно-монтажных работ от 16.07.2009 г., от 16.07.2010 г., от 05.04.2011 г., от 21.04.2011 г., от 21.02.2012 г., № 2-203Ж-036/09.

Местонахождение строящегося объекта: г. Минск, пересечение улиц Щорса – Железнодорожная в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса.

Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства:

Детское кафе – 210,3 кв.м.

Офис – 79,68 кв.м.

Цена одного квадратного метра в помещении административного назначения общей площади нежилых помещений (без отделки) составляет – 5 000 000 белорусских рублей.

Цена одного машино-места – 106 000 000 белорусских рублей.

Данные о правах Застройщика на земельный участок: земельный участок предоставлен Застройщику решением Мингорисполкома от 09.10.2008 г. № 2378(I) площадью 35784 га, граничит с земельными участками г. Минска, УП «Минское отделение Белорусской железной дороги».

Элементы благоустройства: создаются площадки для отдыха, занятия спортом, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

Общее имущество дольщиков – межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, крышная котельная, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию – II-е полугодие 2012 г.

Сведения о договорах строительного подряда:

Договор подряда с ООО «Буд-М» № 1-09 от 20.05.2009 г.

Условия ознакомления с информацией по проекту:

по тел.: 8-017 219-78-22, VELCOM 8-029 3042784, МТС 8-033 6372565, на сайте www.lada.by либо по адресу: ул. Грушевская, 91, пом. 4Н, каб. 5.

11.06.2012 г.

УНП 100934617